Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2013-11-15

# Захапляліся, спачувалі

**Значны ўклад у беларускае краязнаўства ўнеслі некаторыя расійскія даследчыкі. Сярод іх — гісторык, археолаг, доктар гістарычных навук Леанід Аляксееў, які нарадзіўся ў 1921 г. у Растове-на-Доне.**

Ён закончыў Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. Ламаносава, працаваў у Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі, быў аспірантам Інстытута гісторыі АН БССР. З 1953 года — у Інстытуце археалогіі АН БССР, потым выкладаў археалогію ў Магілёўскім дзяржаўным педагагічным інстытуце. Вывучаў гісторыю археалогіі, архітэктуры, мастацтва, краязнаўства Полацкай і Смаленскай зямель IX — XIII стст., праводзіў археалагічныя раскопкі Браслава, Друцка, Мсціслава, Рослаўля. Даследаваў гісторыю Кіеўскай Русі, Смаленскай зямлі, пытанні засялення і развіцця заходнерускіх (беларускіх) зямель у XI — XIII стст., гісторыю Беларусі XIX ст. Шматлікія працы Леаніда Аляксеева вызначаюцца дасканалым і грунтоўным крыніцазнаўчым аналізам, шырокімі аналогіямі, вобразнасцю мовы.

У 1996 годзе ў Мінску выйшла кніга Л. Аляксеева «Археология и краеведение Беларуси XVI в. — 30-е годы XX в.», у якой змешчаны матэрыялы і дакументы пра расійскіх і беларускіх гісторыкаў, археолагаў, краязнаўцаў, што ў розныя часы вывучалі і занатоўвалі звесткі пра ўмовы жыцця беларускіх сялян і гараджан. У выданні змешчаны артыкулы пра Мацея Стрыйкоўскага, Ігнацыя Кульчынскага, Васіля Тацішчава, Фёдара Нарбута, Мікалая Румянцава і г. д.

Цікавыя звесткі пра Беларусь пакінуў падарожнік, натураліст, батанік Аляксандр Башняк, які нарадзіўся ў 1786 годзе. Праехаўшы па беларускіх землях у 1815 годзе, ён напісаў «Дневные записи путешествия А. Бошняка в разные области Западной и Полуденной России в 1815 г.» (Масква, 1820, т. I; Масква, 1821, т. II). Аўтар пакінуў цікавыя звесткі пра краявіды, населеныя пункты Беларусі, у тым ліку і пра Мінск. Ён адзначаў, што на ўскрайку Мінск падобны да рускага горада, а ў цэнтры — да польскага. Быў А. Башняк у Бабруйску і Бабруйскай крэпасці. Ён лічыў, што заходнія паветы Смаленшчыны, дзе жылі беларусы, у этнічных і этнаграфічных адносінах не адрозніваліся ад усходніх паветаў Віцебскай губерні. Са спачуваннем і болем пісаў пра прыгонных сялян. Цікавіўся этнаграфіяй, краязнаўствам, звычаямі, беларускай мовай і мясцовымі дыялектамі. Рабіў спробы вызначыць геалагічнае мінулае Беларусі, яе глебу і кліматычныя ўмовы, якія ўплываюць на ўраджайнасць і стан лясоў, асабліва на Полаччыне.

Ёсць у яго цікавыя назіранні і для археолагаў. Прынамсі, А. Башняк прыкмеціў, што курганы ў розных месцах Беларусі маюць розную велічыню. Самыя вялікія часцей за ўсё сустракаюцца паміж рэкамі Свіслач і Галышка. Згадвае даследчык і пра крапасныя валы. Цікавыя яго этнаграфічныя назіранні, краязнаўчыя нататкі. Ён, у прыватнасці, пісаў: «Крестьянское строение в Литве (Беларусі. — **А. В.**) вообще похоже на белорусские. За Бобруйском же примечается некоторая разность. Строение, хоть очень бедное и избы малые весьма редко с окнами на улицу, но с тесовыми кровлями…»

Здзіўляла падарожніка страшэнная галеча беларускіх сялян: «Лошади столь малорослы и вообще столь сморены, что кости из-под кожи видны, коровы — также невелики… свиней держат несравненно более, чем в России».

У 1831 годзе А. Башняк загінуў пры нявысветленых абставінах.

Анатоль Валахановіч. Захапляліся, спачувалі

**Анатоль ВАЛАХАНОВІЧ**